рюються. Так, прикметною рисою Романа Винника є так «до кінця не розгадана усмішка». Він «*усміхається не всміхаючись*, – такий чоловік! І все завдяки мереживу зморщок та особливій складці житніх вусів… Сердитим Романа-степового ми рідко бачили.*Усе* більше в *усмішці*, справжній чи гаданій» [1, с.70]. Говорячи про Соню, що щиро кохає свого чоловіка, О. Гончар завжди звертає увагу на її очі та погляд. Вона *дивиться* на Кирила Заболотного «*ніжно*, мов перед розлукою» [1, с.30], «*сама ніжність була…в її погляді*» [1, с.208], *очі* Софії «*стають сяючі, просто розкішні*» [1, с. 30], «*наливаються синявою…, глибшають і мовби ростуть*» [1, с.46].

Отже, кожна подробиця та деталь невербальної поведінки промовляють щось вагоме про властивості характеру героїв роману «Твоя зоря» та про авторське до них ставлення. Усі кінеми пов'язані з концепцією персонажа в системі дійових осіб, з його фізіогномічною ідеєю. Виконуючи різноманітні функції, невербальні компоненти відображають і вплив усних форм спілкування на письмове. Поєднання їх з вербальними одиницями, особливості мовної репрезентації рухів формують також індивідуальний стиль Олеся Гончара. Як і у процесі живого спілкування, жести дають можливість читати «між рядками», більш точно розпізнати характери, тим самим дозволяючи глибше проникнути в сюжет твору.

**Література**


1. Гончар, О. Твоя зоря / О. Гончар. – К. : Радянський письменник, 1980. – 360 с.
2. Крейдлин, Г. Е. Невербальная семиотика / Г. Е. Крейдлин – М. : Новое литературное обозрение, 2002. – 592 с.
3. Лотман, Ю. М. Декабрист в повседневной жизни (бытовое поведение как историко-психологическая характеристика / Ю. М. Лотман // Литературное наследие декабристов. – Л. : Наука, 1975. – С. 25-74.



**L. M. Kornieva**
Poltava V. G. Korolenko National Pedagogical University
e-mail: ludmila_korneva@ukr.net


**The characters of Oles Honchar through the prism of non-verbal behavior**


*The non-verbal means of communication, its functions in the process of communication and correlation with the speech information in the novel "Tvoya Zoria" by O. Honchar are researched in the article. Special attention is paid to the nominations of the literary kinemes, which not only characterize the heroes' behavior, but also give a possibility to create their exact psychological portrait and to realize the author's attention.*



*Key words: communication, non-verbal components of communication, kinemes, nominations of the literary kinemes, gesture and mimic portrait.*



**Н.А. Кухарава**
Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя М.Танка
e-mail: kuhareva.79@mail.ru



УДК 373.5.016:821.1613


## МАСТАЦКАЯ ЛІТАРАТУРА Ў СУЧАСНАЙ ШКОЛЕ ЯК ФОРМА ГРАМАДСКАЙ СВЯДОМАСЦІ, ЯК МАСТАЦТВА І ЯК НАВУКОВАЯ ДЫСЦЫПЛІНА


*Ключавыя словы: мастацкая літаратура, функцыі мастацкай літатратуры, грамадская свядомасць, мастацтва слова, навука.*



*У артыкуле разглядаюцца некаторыя з асноўных функцый мастацкай літратуры і іх узаемасувязь. Паказана значнасць шматфункцыянальнага падыходу да вывучэння літаратуры ў сучаснай школе.*


Мастацкая літаратура – гэта складаная з'ява, якая развіваецца ў прасторы і часе. Як дзейнасць пісьменніка і чытача, яна валодае сістэмай шматлікіх функцый: гістарычнай, гнасеалагічнай, лагічнай, аксіялагічнай, эстэтычнай, этычнай, светапогляднай, ідэалагічнай, прагнастычнай і камунікатыўнай.

Мастацкая літаратура – адна з форм грамадскай свядомасці. Падобна навуцы, яна па-свойму адлюстроўвае і асэнсоўвае жыццё. Яе прадмет – чалавек і ўвесь свет вакол яго. Такое разуменне мастацкага і навуковага бачання рэальнасці вынікае з таго, што ў навукі і літаратуры агульная аснова і агульныя мэты. Тым не менш, існуе адрозненне ў сродках, якімі літаратура і навука выяўляюць свой змест: літаратура – вобразамі, навука – адцягненымі паняццямі. Аб гэтым яшчэ больш дзвюх тысяч год таму пісаў Арыстоцель, вызначаючы мастацтва як «перайманне прыроды». Ідэі пра тое, што навука і мастацтва – два спосабы мыслення, а спецыфічная якасць мастацтва – вобразнасць, цяпер падзяляе большасць тэарэтыкаў. Аднак спрэчкі пра сутнасць мастацтва не спыняюцца. Сцверджанне аб боскіх вытоках мастацтва, вядомае з часоў Гамэра, не адмаўляецца


Репозиторий ВГУ

даследчыкамі ў наступныя стагоддзі (І. Кант, В. Іванаў, А. Рычардс і інш.). З гэтага вынікае, што мастацтва і творчасць – з'явы, якія не паддаюцца адназначнаму тлумачэнню.Мастацкая літаратура заўсёды аповед і адкрыццё, адметны летапіс гістарычнага жыцця нацыі, што вызначае яе светапоглядную і культурную вартасць.

Вышэйшая ступень навуковых ведаў складаецца ў ходзе тэарэтычнага асэнсавання мінулага, якое дае магчымасць патлумачыць складаную і супярэчлівую гісторыю чалавецтва, заканамернасці яе развіцця. Фрагменты навуковых ведаў прысутнічаюць і ў літаратурных творах.

Аб сацыяльна-гістарычнай функцыі літаратуры сведчыць яе актыўнае выкарыстанне на вучэбных занятках па гісторыі. На думку педагогаў, мастацкая літаратура служыць важнай крыніцай звестак пра гістарычнае мінулае і эфектыўным сродкам эстэтычнага і маральнага выхавання навучэнцаў. Мастацкі вобраз характарызуецца выразнасцю і пераканаўчасцю. Яго доказная сіла выхоўвае ў вучняў адпаведныя адносіны да гістарычных падзей і асоб, выклікае пэўныя эмацыянальныя рэакцыі. Яскравы вобраз комплексна ўздзейнічае на асобу навучэнца: яго розум, волю, паводзіны, – таму што этычныя нормы раскрываюцца на жывых прыкладах і ў канкрэтных гістарычных сітуацыях.

Мастацкая літаратура з'яўляецца носьбітам пэўнай традыцыі, якая склалася гістарычна, і не толькі ўдзельнічае ў фарміраванні пэўных ідэалаў, ідэй і каштоўнасцяў, але і папулярызуе іх у грамадстве, спрыяючы захаванню ў грамадскай свядомасці.

Такім чынам, мастацкая літаратура не толькі носьбіт эстэтычнага ідэалу, але і сутнасны фактар, які яго фарміруе пачынаючы з выхавання мастацкага густу. Іманентнымі ёй выяўленчымі сродкамі літаратура актуалізуе ў чытача пэўныя пачуцці, перажыванні, сцвярджае ў свядомасці грамадства адпаведныя ацэнкі сацыяльнай рэальнасці, тым самым пабуджаючы асобу да фарміравання і прымання пэўнай жыццёвай пазіцыі, у тым ліку ідэалагічных арыенціраў.

Вывучэнне літаратуры як мастацтва слова прадугледжвае спасціжэнне твора ў адпаведнасці з яго эстэтычнай прыродай, г. зн. з улікам эмацыянальна-вобразнага ўспрымання, родавых і жанравых асаблівасцяў, аўтарскай пазіцыі і індывідуальнага стылю пісьменніка, адзінства зместу і формы.

Літаратура належыць да сацыяльна-гуманітарнага цыклу прадметаў. З яе дапамогай рэалізуецца асноўная мэта навучання і выхавання – «фарміраванне гарманічнай асобы, інтэлектуальна развітай, здольнай усведамляць ролю маралі, этыкі ў асабістым і грамадскім жыцці, адчуваць і ацэньваць прыгожае, дасканала валодаць мовай» [1, с.80]. Разам з тым літаратура ў школе, як адзначаў акадэмік М.А. Лазарук – «гэта не асновы навук, як большасць прадметаў, гэта прадмет, дзе галоўнае – само «прыгожае пісьменства», а не літаратуразнаўства» [2, с.62]. Гэта азначае, што літаратура ў школе павінна разглядацца найперш як мастацтва слова.

Так, аналізуючы на ўроку пейзажную лірыку, настаўнік вядзе з вучнямі размову пра асобу аўтара, яго перажыванні і светаўспрыманне. Вялікі эпічны твор са шматлікімі героямі пашырае магчымасці пазнання чалавечых характараў. Творы мастацкай літаратуры здзяйсняюць камунікатыўную функцыю праз дыялогі паміж героямі, аўтарам і чытачом, паміж чытачамі, канкрэтнымі тэкстамі і мноствам кантэкстаў. Літаратура больш за іншыя дысцыпліны ўплывае на эмацыянальную сферу вучня і таму выконвае важную выхаваўчую функцыю. Яна спрыяе фарміраванню духоўнага свету, светапогляду, светаразумення школьніка, здольна вызначыць маральныя крытэрыі на далейшае жыццё. Маральнае ў мастацкай літаратуры непадзельна звязана з эстэтычным. «У сапраўднага талента два плячы, – гаварыў Л. Талстой, – адно плячо – этыка, другое – эстэтыка» [3, с.231]. За эстэтычнай функцыяй літаратуры найперш стаіць выхаванне ў вучняў эстэтычнага густу, якое ажыццяўляецца ўсімі яе кампанентамі. Найбольш важнае значэнне мае вобраз станоўчага героя. Думкі і пачуцці, паводзіны і ўчынкі літаратурных асоб маюць не толькі маральную вартасць, але і эстэтычную афарбоўку. Менавіта станоўчыя героі літаратуры, эмацыянальна ўплываючы на школьнікаў, абуджаюць у іх лепшыя якасці, навучаюць жыццю. Аднак не меншы патэнцыял маральна-эстэтычнага выхавання вучняў адкрываецца пры аналізе вобразаў адмоўных персанажаў. Нельга цалкам зразумець прыгожае, не асэнсаваўшы агіднага. Творы, «заселеныя» толькі адмоўнымі героямі (як раман А. Мрыя «Запіскі Самсона Самасуя»), тым не менш уплываюць на фарміраванне станоўчых якасцяў і эстэтычнага густу чытача. Гэта тлумачыцца і суб'ектыўным фактарам у літаратуры: адлюстраванае ў творы праламляецца праз аўтарскае ўспрыманне, а сіла і якасць уплыву твора на чытача якраз у многім залежыць ад аўтарскай пазіцыі, эстэтычных і маральных ідэалаў. Мастацкая літаратура, як адзін з відаў пазнання рэчаіснасці, адлюстроўве вострую барацьбу новага са старым, гуманнага з нялюдскім. Маральнае непрыманне ў школьнікаў выклікаюць такія сацыяльна-псіхалагічныя тыпы, як Лаўрук («На каляды к сыну» З. Бядулі), бацька і сын Хамёнкі («Галя» Я. Брыля). Няма падстаў непакоіцца, што іх паводзіны стануць для школьнікаў прыкладам. Яны агідныя як людзі, але маюць вартасць як тварэнне аўтара, як мастацкія вобразы-тыпы, у якіх дасканала раскрыты людскія заганы.

Рэпазіторый ВДУ

Калі чытач любіць творы канкрэтнага аўтара, то ён прымае і яго эстэтычныя погляды, яго эстэтычны ідэал.  У гэтым выяўляецца і аксіялагічная функцыя мастацкай літаратуры. Аксіялагічная функцыя характарызуе каштоўнасныя адносіны да наваколля, якія з'яўляюцца пэўнай формай узаемадзеяння чалавека са светам. У пэўнай ступені аксіялагічную вартасць творам надае ўнікальнасць пісьменніцкага вопыту. Удзельнікі экспедыцый, падарожжаў, войнаў могуць заўсёды разлічваць на большую цікавасць да сваіх успамінаў ( Э. Хэмінгуэй, Н. Рэрых, В.Быкаў і інш.). Аднак варта адзначыць, што ў ацэнках, якія даюцца ў творах, не заўсёды заключаецца поўная ісціна. Нягледзячы на імкненне творцаў да аб'ектыўнасці, галоўнай іх задачай застаецца адлюстраванне рэчаіснасці ў мастацкіх вобразах, а не філасофскі пошук ісціны. Аднак у гэтым нам бачыцца не загана літаратуры, а яе пэўная вартасць бо ў ходзе рэалізацыі аксіялагічнай функцыі ў «полі» мастацкай літаратуры пачынаюць зладжана суіснаваць жыццёвы вопыт, светапогляд, пэўныя гістарычныя і сацыяльныя ўмовы, элементы навуковых ведаў. І ў чытача заўсёды ёсць магчымасць, пасля ўласнага пераасэнсавання, пагаджацца з аўтарам або не.

Мастацкая літаратура як адзін з асноўных відаў мастацтва – з'ява пастаянная, гістарычна абумоўленая. Створаныя таленавітым пісьменнікам у пэўны гістарычны перыяд мастацкія вобразы і тыпы не страчваюць сваёй значнасці ў наступныя эпохі. Рэалізуючы закладзены ў іх гнасеалагічны, маральна-эстэтычны, светапоглядны патэнцыял, яны прымаюцца ў спадчыну пакаленнямі, раскрываючы ўсё новыя і новыя грані невычэрпнага жыццёвага зместу. Мастацкая літаратура не толькі стварае шэдэўры з духоўнымі каштоўнасцямі грамадства –яна акумулюе іх у сацыяльнай памяці і распаўсюджвае ў сацыяльнай прасторы і часе, робячы набыткам усяго чалавецтва. Без гэтага сацыяльная рэчаіснасць страчвае многія пазнавальныя, этычныя, эстэтычныя і іншыя адценні, без якіх збядняецца карціна свету. Пры ўзаемадзеянні з навукай, філасофіяй і мараллю, літаратура не проста пераймае іх змест, а ўзбагачае і пераўтварае яго, ствараючы эстэтычную рэальнасць, якая не мае адназначнага перакладу на іншыя мовы грамадскай свядомасці.

**Літаратура**


1. Канцэпцыя вучэбнага прадмета — Беларуская літаратура // Роднае слова. – 2009. – № 8. – С. 80 – 89.
2. Лазарук, М.А. Навучанне і выхаванне творчасцю : педагагічныя роздумы і пошукі / М.А. Лазарук. – Мінск : Нар. асвета, 1994.
3. Белинский, В.Г. Полн. собр. соч.: в 13 т. / В.Г. Белинский. – Москва : Изд-во АН СССР, 1953 – 1956. – Т. 1.



**N.A. Kukharava**
Belarusian State Pedagogical University named after M. Tank
e-mail: kuhareva.79@mail.ru


**Fiction in the modern school as a form of social consciousness, as an art and as a scientific discipline**


*Key words:literature,the functions of fiction, social consciousness, word art, science*



*This article discusses some of the main functions of the artistic literatury and their relationship.The importance of multi-functional approach to the study of literature in the modern school is showed.*



**О.І. Мокляк**
Полтавський національний педагогічний університет імені В.Г. Короленка
e-mail:moklyako@rambler.ru



УДК 82-6:821.161.2


## ЗАСОБИ СТВОРЕННЯ ЕФЕКТУ "ІНТИМІЗАЦІЇ" В ЛЮБОВНИХ ЛИСТАХ ТАРАСА НІКІТІНА


*Ключові слова: любовна епістолярія, інтимізація, адресат, звертання, прощальні вирази.*



*У статті досліджено мовну поведінку Тараса Нікітіна у приватному листуванні з дружиною, зокрема проаналізовано звертальні та прощальні вирази як основні засоби створення ефекту «інтимізації» в любовній епістолярії.*


Любовні листи, зважаючи на їхню моноадресатність, є благодатним і об'єктивним матеріалом для дослідження явища інтимізації. У такій епістолярії, за слушним твердженням Михайлини Коцюбинської, "якнайменше "маски" і якнайбільше "обличчя" [1, с.38], автор, адресуючи своє послання коханій людині, намагається бути щирим, відкритим, добирає мовні засоби, що надають емоційності повідомленню, слугують вираженню ніжних почуттів, зближенню комунікантів, створенню ефекту невимушеної бесіди.

У сучасній україністиці чимало праць присвячено вивченню інтимного епістолярного дискурсу, зокрема об'єктом аналізу стали листи Олександра Довженка (Р. Корогодський, С. Тримбач), Ольги Кобилянської (М. Павлишин, В. Бабій), Михайла Коцюбинського (І. Стебун), Миколи Куліша (Н. Кузякіна),




Репозиторий ВГУ